Да групы адзінак, што служаць для апісання злога чалавека, мы аднеслі наступныя прыклады:

*мух аб'есціся* – быць не ў гуморы, нервовым, раззлаваным. *Дзед мух аб'еўся, таму мы схаваліся ў кустах* (аграгарадок Ноўка Віцебскі раён);

*нарабіць пустак* – учыніць зло, подласць у адносінах да каго-небудзь. *Ты нарабіў пустак мне!* (вёска Круткі Пастаўскі раён).

**Заключэнне.** Такім чынам, аналіз рэгіянальных устойлівых выразаў, што служаць для апісання негатыўных адносін, дазволіў выдзеліць некалькі семантычных груп, сярод якіх найбольш багатай па колькасці кампанентаў з'яўляецца група фразеалагізмаў-праклёнаў. Гэты від выслоўяў з'яўляецца адной з крыніц ведаў пра ментальную культуру і сістэму каштоўнасцяў беларусаў, іх міфалагічныя ўяўленні. Ужыванне такіх адзінак уласціва прадстаўнікам старэйшага пакалення, людзі ж маладога і сярэдняга ўзросту не выкарыстоўваюць у сваім маўленні фразеалагізмы-праклёны. Не існуе асобна праклёнаў для мужчын і для жанчын: выразы носяць агульны характар і могуць быць ужыты ў дачыненні да прадстаўнікоў двух полаў. Не зафіксавана праклёнаў, накіраваных на дзяцей, што можа быць растлумачана асаблівымі, беражлівымі адносінамі беларусаў да сваіх дзяцей.

Выяўлены і прааналізаваны фактычны матэрыял паказаў на існаванне ў межах рэгіянальнай фразеалогіі з'явы лексічнай, акцэнтнай і камбінаванай варыянтнасці: *хай іх хра́нцы парвуць, хай іх (яго, яе) пранцы́ (пра́нцы), хра́нцы на цібе.* Розныя варыянты аднаго і таго ж устойлівага выразу бытуюць як у межах аднаго раёна (Гарадоцкага), так і на тэрыторыі Віцебскай вобласці ў цэлым.

1. Дзядова, А.С. Чалавек у люстэрку беларускай фразеалогіі і парэміялогіі: манаграфія / А.С. Дзядова. – Віцебск: ВДУ імя П.М. Машэрава, 2013. – 162 с. https://rep.vsu.by/handle/123456789/3208 (Дата звароту: 03.09.2023).
2. Лепешаў, І.Я. Этымалагічны слоўнік фразеалагізмаў / І.Я. Лепешаў. – Мінск: БелЭн, 2004. – 448 с.
3. Рэгіянальны слоўнік Віцебшчыны: у 2 ч. / Л. І. Злобін (рэд.) [і інш.]. – Віцебск: УА "ВДУ імя П. М. Машэрава", 2012. – Ч. 1. – 304 с. https://rep.vsu.by/handle/123456789/14704 (Дата звароту: 03.09.2023).
4. Рэгіянальны слоўнік Віцебшчыны: у 2 ч. / склад.: Г К. Семянькова, Т.А. Грачыха, А С. Дзядова [і інш.]; пад рэд. А.С. Дзядовай. – Віцебск: ВДУ імя П.М. Машэрава, 2014. – Ч. 2. – 358 с. https://rep.vsu.by/handle/123456789/14042 (Дата звароту: 03.09.2023).

## МАСТАЦКАЯ САМАБЫТНАСЦЬ ВОБРАЗА ЦМОКА Ў ЦЫКЛЕ АПАВЯДАННЯЎ "ШЛЯХЦІЦ ЗАВАЛЬНЯ, АБО БЕЛАРУСЬ У ФАНТАСТЫЧНЫХ АПАВЯДАННЯХ" ЯНА БАРШЧЭЎСКАГА

***Вялічка К.Э.,***
*студэнтка 3 курса ВДУ імя П.М. Машэрава, г. Віцебск, Рэспубліка Беларусь*
*Навуковы кіраўнік –* ***Падстаўленка В.Ф.,*** *канд. філал. навук, дацэнт*

Ключавыя словы. Міфалогія, вобраз, сюжэт, цмок, мастацкая адметнасць.
Keywords. Mythology, image, plot, dragon, artistic highlight.

Вобразная сістэма беларускай літаратуры на розных этапах развіцця папаўняецца за кошт разнастайных міфалагем. Аднак гэтыя вобразы не бяруцца ў гатовым выглядзе і не з'яўляюцца статычнымі. Яны спалучаюць у сабе звесткі з міфалогіі, а таксама вынікі аўтарскага пераасэнсавання. Напрыклад, з міфалогіі ў беларускую літаратуру былі запазычаныя вобразы чарнакніжнікаў, ваўкалакаў і іншых нячысцікаў.

Актуальнасць даследавання: матэрыялы нашага даследавання дапаўняюць агульную карціну асэнсавання беларускай ментальнасці XIX ст. Вынікі праведзенага даследавання могуць быць выкарыстаныя пры выкладанні беларускай літаратуры ў школах і ВНУ.

Мэта даследавання: раскрыць мастацкую непаўторнасць вобраза цмока ў названай кнізе Я. Баршчэўскага, выявіць вынікі сінтэзу міфалагічных пачаткаў і аўтарскага вымыслу ў структуры дадзенага персанажа.

**Матэрыял і метады.** Матэрыялам для даследавання паслужылі апавяданні Я. Баршчэўскага “Шляхціц Завальня, або Беларусь у фантастычных апавяданнях”. Пры правядзенні даследавання былі выкарыстаныя элементы канкрэтна-аналітычнага і параўнальна-гістарычнага метадаў.

**Вынікі і іх абмеркаванне.** У XIX ст. значная ўвага пісьменікаў скіраваная на міфалагічныя і фальклорныя традыцыі. Міфалагема цмока шырока функцыянуе не толькі ў тэкстах па беларускай міфалогіі, фальклоры, але і ў творах айчыннай літаратуры, што ўзніклі на розных этапах яе развіцця. У цэлым, вобраз цмока дастаткова распрацаваны аўтарамі. Адным з першых пісьменнікаў, які звярнуўся да гэтага вобраза, быў Ян Баршчэўскі. У цыкле “Шляхціц Завальня, або Беларусь у фантастычных апавяданнях” міфалагема фігуруе ў некалькіх апавяданнях. Пры тым вобраз цмока з’яўляецца блізкім да міфалагічнага. Пісьменнік уносіць нязначныя ідэйныя змяненні, заснаваныя на асабістым вымысле.

У першым апавяданні (“Пра чарнакніжніка і пра цмока, што вылупіўся з яйка, знесенага пеўнем”) Я. Баршчэўскі апісаў спосаб нараджэння пачвары: “Калі не мееш свайго чорнага пеўня, дык расстарайся дзе-небудзь, накармі яго гэтым зернем, і ён праз колькі дзён знясе яйка не большае за галубінае. Гэтае яйка ты павінен насіць месяц пад пахаю. Праз месяц з яго вылупіцца маленькая яшчарка” [1, с. 31]. Гэтую яшчарку трэба карміць малаком з далоні, хутка яна вырасце і будзе прыносіць гаспадару скарбы. Такі сюжэт апісаны і ў беларускай міфалогіі, аднак Баршчэўскі падаў яго ў спрошчаным варыянце: чарнакніжнік дае герою зерне, каб певень хутчэй знёс яйка, калі ў міфалагічнай традыцыі пеўня трэба гадаваць сем гадоў, і толькі на апошнім годзе ён знясе яйка.

У апавяданні цэнтральны герой Карпа выканаў параду чарнакніжніка: “Гэтую бязбожную параду Карпа выканаў ахвотна. Выгадаваў жахлівага цмока” [1, с. 31]. Пачвара дапамагае герою разбагацець і пабрацца шлюбам з Агапкай. Акрамя таго, цмок носіць багацце свайму гаспадару, чым палохае іншых людзей: “Аднойчы і я, калі гнаў коней на начлег, бачыў, як ляцела тое страшыдла з шумам рассыпаючы вакол сябе іскры, нібы распаленае жалеза пад молатам каваля, і пад дахам Карпавай хаціны распалася на дробныя частачкі” [1, с. 31]. Вынікае, што цмок – гэта лятучы змей, непасрэдна звязаны са стыхіяй агню. А таксама ў тэксце робіцца акцэнт на яго жахлівым выглядзе.

Далей у творы Баршчэўскага цмок ператвараецца ў прыгожага хлопца і імкнецца спакусіць жанчыну. Аднак яна не паддаецца спакусе, згадвае імя Бога, і пачвара знікае: “Ледзь вымавіла імя Маці Божае, – успыхнуў ён полымем і знік у імгненне вока” [1, с. 41]. Такім чынам, падкрэсліваецца, што пачвара звязаная з нячыстай сілай. Факт травістацыі цмока ў хлопца фіксуецца і ў міфалогіі: “Бывае, што змей улятае праз комін і ў хаце ператвараецца ў прыгожага хлопца” [2, с.188].

Хоць цмок з апавядання і прыслужвае Карпу, ён робіць гэта толькі таму, што той з’яўляецца несумленным чалавекам. Можна сказаць, што Карпа заключае дамову з нячыстай сілай. Калі яна не выконваецца, цмок нішчыць усё створанае полымем, а ў хуткім часе забірае душу героя. У дадзеным эпізодзе акрэсліваецца повязь цмока з вогненай сферай, што характэрна і для міфалогіі, дзе ён звязаны з усімі чатырма стыхіямі.

У дадзеным сюжэце цмок, выведзены штучна, атаясамляецца з нячысцікам, таму ён баіцца ўсяго, звязанага з Богам. Вобраз пачвары надзяляецца выключна адмоўнай канатацыяй і фактычна тоесны чорту.

Вобраз цмока ў міфалагічным светапоглядзе беларусаў быў звязаны з касмагарыяй і касмалогіяй. Палёт каметы нашыя продкі ўспрымалі палётам цмока, які нясе свайму гаспадару скарбы. У апавяданні “Зухаватыя ўчынкі” Я. Баршчэўскі, звярнуўся менавіта да гэтага сюжэта: “Аднаго разу ўлетку ў ціхую, пагодлівую ноч з поўначы на поўдзень ляцеў, палаючы агнём, цмок, нёс нібыта з сабою шмат золата і срэбра грэшніку, які прадаў д’яблу душу” [1, с. 53]. Зноў жа цмок, з’яўляючыся нячыстай сілай, баіцца Божага імя, таму, калі людзі пачынаюць маліцца, ён ператвараецца ў камень, а скарбы самі закапваюцца ў зямлю: “Раптам раскалоўся блакіт неба, разлілося вялікае святло, людзі, молячыся, кленчаць, а цмок, выцяты промнем нябеснага святла, дранцвее ўвесь, валіцца на пагорку і ператвараецца ў камень. Скарбы ж, золата і срэбра, якія ён нёс з сабою, на тым самым

месцы самі закапаліся ў зямлю, і з таго часу з'яўляліся ўначы ў розных канцах пагорка ў розных постацях" [1, с. 53]. Згодна з легендамі, хто пераначуе каля Цмокава каменя, той атрымае яго багацце. Са сказанага вынікае, што цмок у творчасці Баршчэўскага з'яўляецца выключна адмоўным персанажам. У прааналізаваным сюжэце пісьменік акрэслівае повязь цмока са стыхіямі агню, паветра і (часткова) зямлі, тым самым пашыраючы адпаведную міфалагічную рэцэпцыю дадзенага персанажа.

**Заключэнне.** Вобраз цмока звязаны з рэлігійнымі, касмалагічнымі і касмагарычнымі ўяўленнямі нашых продкаў. Ян Баршчэўскі ўсебакова акрэсліў асаблівасці светапогляду тагачасных беларусаў. Пісьменік ў апавяданнях цыкла "Шляхціц Завальня, або Беларусь у фантастычных апавяданнях" раскрыў вобраз цмока як увасабленне зла, магутнага нячысціка. За аснову аўтар ўзяў міфалагічныя звесткі, аднак звярнуўся і да вымыслу. Так, спосаб нараджэння цмока спрашчаецца. У апавяданнях персанаж паказаны як магутная пачвара, здольная да палёту і травестацыі ў прыгожага хлопца. Цмок у творчасці Баршчэўскага атаясамляецца з чортам, таму баіцца імя Бога. Такім чынам, як і ў большасці фальклорных казак, міфалагема цмока надзеленая ў кнізе адмоўнай канатацыяй. Акрамя вышэй сказанага, пісьменік акрэсліў сувязь цмока з трыма асноўнымі стыхіямі, што таксама характэрна для міфалагічных сюжэтаў.

1. Баршчэўскі, Я. / Шляхціц Завальня, або Беларусь у фантастычных апавяданнях / Я. Баршчэўскі – Мінск: Маст. літ., 1990. – 383 с.

2. Крикливец, Е.В. Рецепция фольклорно-мифологических традиций в прозе lрусских и белорусских писателей второй половины XX века / Е.В. Крикливец // Наука – образованию, производству, экономике: материалы XXI(68) Регион. науч.-практ. конференции преподавателей, науч. сотрудников и аспирантов, Витебск, 11-12 февраля 2016 г.: в 2 т. – Витебск: ВГУ имени П.М. Машерова, 2016. – Т. 1. – С. 131-133.–URL: https: // rep.vsu.by/handle/123456789/7758 (дата обращения: 03.09.2023).

3. Санько, С, Валодзіна, Т., Васілевіч, У. / Беларуская міфалогія: Энцыклапед. Слоўн. / С. Санько, Т. Валодзіна, У. Васілевіч. – Мінск: Беларусь, 2004. – 592 с.

## ГАЛЕРЭЯ ПАРТРЭТАЎ ВЯСКОЎЦАЎ У ТРЫЛОГІІ Я. КОЛАСА "НА РОСТАНЯХ"

***Голад Д.А.,***
*студэнтка 1 курса БрДУ імя А.С. Пушкіна, г. Брэст, Рэспубліка Беларусь*
*Навуковы кіраўнік –* ***Поўх І.В.,*** *канд. філал. навук, дацэнт*

Ключавыя словы. Беларуская літаратура, псіхалагізм, Якуб Колас, "На ростанях", літаратурны партрэт.

Keywords. Belarusian literature, psychologism, Yakub Kolas, *At the crossroads*, literary portrait.

Трылогія "На ростанях" класіка беларускай літаратуры Якуба Коласа – адзін з першых беларускіх раманаў, якія заклалі падмурак для станаўлення і развіцця адпаведнага жанру ў беларускай літаратуры. У раманах трылогіі створана грунтоўная і ўсебаковая карціна жыцця вясковай інтэлігенцыі і беларускага сялянства пачатку XX стагоддзя. Жанравая форма сацыяльна-псіхалагічнай аповесці з выкарыстаннем аўтабіяграфічнага матэрыялу [1] дазволіла пісьменніку стварыць галерэю партрэтаў тыповых жыхароў беларускай вёскі ў лепшых традыцыях мастацкага псіхалагізму і псіхааналізу ў т. зв "вялікай прозе". Мэта даследавання – апісаць мастацкія сродкі партрэтызацыі, выкарыстаныя для стварэння вобразаў вяскоўцаў у трылогіі Я. Коласа "На ростанях". Актуальнасць даследавання абумоўліваецца вялікай выхаваўчай функцыяй трылогіі як крыніцы інфармацыі пра традыцыйную культуру, светапогляд і менталітэт беларусаў.

**Матэрыял і метады.** Даследаванне выканана на матэрыяле раманаў "У палескай глушы", "У глыбі Палесся" і "На ростанях", якія склалі трылогію. Асноўныя метады даследавання – апісальна-функцыянальны, псіхалагічны і культурна-гістарычны.

**Вынікі і іх абмеркаванне.** Цэнтральнае месца ў трылогіі "На ростанях" займаюць вобразы жыхароў беларускай вёскі. Партрэты палешукоў паўстаюць перад чытачом ужо з першых старонак твора. У адпаведнасці з функцыяй, якую яны выконваюць у рамане,